# «Буктрэйлер па кнігам Я.Купалы і Я. Коласа»

**Вучань 7 «А» класа, СШ№7 г.Баранавічы Я. Дзерман**

**2017**












**22 кастрычніка(3 лістапада)** 2017- 135 гадоў з дня нараджэння **Якуба Коласа** ( Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча)
**(1882–1956),** народнага паэта Беларусі.
**7 ліпеня** -135 гадоў з дня нараджэння **Янкі Купалы**(Івана Дамінікавіча Луцэвіча) **(1882-1942**), паэта, драматурга, публіцыста, грамадскага дзеяча, народнага паэта Беларусі, акадэміка НАН Беларусі і НАН Украіны, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР (ф. Вязынка Вілейскага павета (цяпер Маладзечанскі раён Мінскай вобласці).



**Купала і Колас, вы нас гадавалі!..**

*Мы з вамі выходзілі заўжды ў дарогу*

*А як акрыляла нас ваша слова,*

*Што сказана простаю матчынай мовай!*

*Мы з вамі адолелі буры і хвалі…*

*Купала і Колас, вы нас гадавалі…*



«Беларускі гусляр». Малюнак зроблены выбітным рускім этнографам XIX — пач. XX ст. Н. І. Прывалавым.

Апублікаваны ў 1926



Янка Купала,
народны паэт Беларусі



"Я не паэта, о крый мяне Божа!
Не рвуся я к славе гэткай німала,
Хоць песеньку-думку і высную можа,
Завуся я толькі – Янка Купала"

«Я не паэта»

# Паэма " КУРГАН"



**Курган** — паэма-балада Я.Купалы, якая лічыцца адным з лепшых героіка-рамантычных твораў Купалы і шэдэўрам беларускай літаратуры. Гэтай паэмай адкрываецца шэраг фальклорна-рамантычных паэм у творчасці Я. Купалы дакастрычніцкага часу. Паэма была завершана класікам *23* мая *1910* года ў Пецярбургу і ўпершыню апублікавана ў газеце «Наша Нива» *21* чэрвеня *1912* года.



Паэма прысвечана лёсу мастака ў грамадстве. На вяселле дачкі князь кліча мясцовага Гусляра і патрабуе ад яго песень у сваю хвалу і на пацеху вяльможным гасцям. Ён папярэджвае музыку, што пакарае смерцю, калі той не выканае загад. Але замест пахвалы князю з вуснаў Гусляра гучыць суровая праўда пра бязлітаснасць і чужасць князя народу, цяжкі паднявольны лёс падданых князя. За непакору і непаслухмянасць князь загадвае закапаць Гусляра жывым разам з гуслямі. Гусляр гіне, але памяць аб ім у народзе вечная, як той курган, што як сімвал народнай памяці ўзнёсся над магілай народнага заступніка. Ідэя паэмы празрыстая: народнай памяці варты толькі той мастак, які аддае справе народа і свае песні, і



сапраўднае мастацтва толькі тое, што служыць на

службе народнай праўдзе — веліч і прызванне мастака.

**«Курган» – шэдэўр не толькі Я. Купалы, але і ўсёй новай беларускай літаратуры.**

**У паэме 12 раздзелаў, кожны з якіх складаецца з 4 катрэнау .**

**Экспазіцыйны 1 раздзел – частка твору шырокага эпічнага размаху. Пачатак сюжэтнага апавядання ў паэме як бы прыспешаны, але завязка дзеяння ў цэлым непаспешлівая, з падрабязным раскрыццём абставін дзеяння – апісаннем княжацкага замку, «бяседы вялікай у князя» (2 і 3 раздзелы) і з падрабязнай характарыстыкай Гусляра (4 і 5 раздзелы).**





У цэнтральных, самых драматычна-напружаных раздзелах (6—10) ідзе дыялог князя і Гусляра. Словы Гусляра вытрыманы на самай высокай ноце.



**У кульмінацыйным 10 раздзеле «Князь стаіць, князь маўчыць, жуда, помста б'е з воч». У 11 раздзеле наступае развязка канфлікту. Заключны раздзел як бы вяртае чытача да першага раздзелу і так узнікае адзінага тону эмацыянальная рамка сюжэтнага дзеяння.**










**Да паэмы Янкі Купалы «Курган» не раз звярталіся кампазітары. Ёй прысвечаныя музычныя творы К. Галкоўскага, Я. Глебава, І. Лучанка, І. Любана, А. Туранкова, У. Чараднічэнкі**





У 1960 годзе І. Лучанок напісаў кантату «Курган» для хору салістаў і сімфанічнага аркестра, на музыку якой Ансамбль «Песняры» ў 79-м прадставіў рок-оперу, якая ўвайшла ў дваццатку лепшых твораў свету, створаных у стылістыцы прагрэсіў-року. У 2011 да 100-годдзя напісання паэмы і 70-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Мулявіна быў прадстаўлены мюзікл «Курган» на музыку І. Лучанка ў аранжыроўцы У. Мулявіна.

# верш «Жняя» Я.Купала

Успомнім, напрыклад, цудоўны верш «Жняя», у якім намаляваны надзвычай прывабны — зямны і адначасова ўзнёсла-адухоўлены —партрэт маладой сялянкі, якая ідзе «ў вяночку паміж спелых гоняў»:

**Каласкі хінуцца**
**Перад ёй паклонна,**
**Дзівіцца ігруша**
**На мяжы зялёнай.**
**А яна — царыца —**
**Весела, шчасліва**
**Карануе песняй**
**Залатое жніва.**
**Смела йдзе у сонца**
**Ўся сама — як сонца,**
**Гэта жнейка наша**
**У нашаей старонцы.**

**Купалаўская жняя — эстэтычнае ўвасабленне нацыянальнага адраджэння, а Купала — яго сімвал, ён як ніхто іншы з беларускіх паэтаў паслядоўна і пераканана развіваў і бараніў ідэю Адраджэння, якая разумелася ім надзвычай шырока і была тоесная самому жыццю з усім яго багаццем і шматстайнасцю. Прыгажосць стала, можна сказаць, ключавым момантам Купалавай творчасці, не ўступаючы, аднак, у супярэчнасць з этычным пачаткам.**



Пасля свята Купалле з 6 на 7 ліпеня ў гонар летняга сонцазвароту падходзіць

**Жніво**



Гэтае свята з'яўляецца самым працяглым комплексам рытуалаў. Пачынала святкавацца ад 12 ліпеня да 27 верасня. Жніўныя абрады складалі аснову самай цяжкай працоўнай дзеі. У пачатку рабілі імянны сноп.

# Жнiво.

**Наспелая постаць шчаслівых пасеваў**
**За вёскай, на сонным лясоў рубяжы,**
**Ссівелы ўжо колас схінула к мяжы**
**У сумным шаптанні: «Дзе, жнеі мае вы?»**

**І жнеі сышліся. – Направа, налева**
**Кладучы ў снапы каласы-старажы,**
**Зашасталі глуха сярпы, як нажы,**
**Пад жніўныя вечна старыя напевы.**

**Спагадная, нудная песня плыве,**
**Губляючы ў пушчы свае пералівы,**
**У шэлестах белага коласу нівы.**



**Плыве гэта песня ка мне і заве,**
**І ў сэрцы звініць, як каса у траве:**
**«Ты так жа, брат, сееш... а дзе тваё жніва?»**

## «Мая доля» — узор міфатворчага мыслення ранняга Купалы.

**Адзін з першых вершаў, напісаных на роднай мове, так «па-багушэвічаўску» і называўся – «Мая доля» (ён якраз адзіны і захаваўся з усяго напісанага ў гэты час). Датуецца 15 ліпеня 1904 г. Купала не ўключыў яго ў першы свой зборнік «Жалейка», аднак верш цікавы як адпраўны пункт працяглай ідэйна-эстэтычнай эвалюцыі паэта:**



**Мая доля, дык вось доля,**
**Каб ты лопнула была!**
**Каб у чыстае дзе поле**
**Ад мяне ты ўцякла!..**
**Не даеш ты мне спакою**
**Ані ўночы, ані ўдзень, –**
**Усё ходзіш ты за мною,**
**Як нябожчыка той цень.**



**Им были написаны такие сборники стихов как**: Жалейка» *(1908);*«Гусляр» *(1910);*«Дорогой жизни» *(1913);*«Наследие» *(1922);* «Безымянное» *(1925);*«Отцветание» *(1930)*«Песня строительству» *(1936);*«Белоруссии орденоносной» *(1937);*«От сердца» *(1940);* «Белорусским партизанам» *(1940).*

**Следующие поэмы**:«Зимой» *(1907);*«Никому» *(1907);*«Калека» *(1907);*«Расплата любовью» *(1907)*«В Пилиповку» *(1908);*«За что?» *(1908);*«Извечная песня» *(1908);*«Курган» *(1910)*«Сон на курган *(1910);*«В Сочельник» *(1911);*«На Дзяды» *(1911);*«Бондаровна «Могила льва» *(1913);*«Она и я» *(1913);*«На привале» *(1913);* «Безымянное» *(1924)*«З угодкавых настрояў» *(1927);* «Над рекой Орессой» *(1933);*«Тарасова доля» *(1939).*

**Пьесы**:«Павлинка» *(1912);*«Примаки» *(1913);*«Раскиданное гнездо» *(1913);*«Здешние» *(1922)*





# Колас Якуб Михайлович

**Колас выступаў як паэт, празаік, драматург, дзіцячы пісьменнік і педагог, публіцыст, крытык, перакладчык**

**«Казка жыцця» ці «Сымон-музыка» - твор рамантычны.**

**І герой тут выключны, надзелены асаблівым дарам успрымаць душой усё багацце гукаў і зменлівых з'яў навакольнага свету. І пакутлівы лёс яго, выгнанага з бацькоўскага дому хлапчука, нельга лічыць звычайным, тыповым, рэалістычным.**

**Паэма «Сымон-музыка» — твор аб народных вытоках мастацтва і яго ролі ў жыцці народа, аб грамадзянскім абавязку мастака, а ў больш шырокім плане — аб духоўным адраджэнні народа ў змрочных умовах**



У паэме з храналагічнай паслядоўнасцю апавядаецца пра блуканні і пакуты таленавітага вясковага музыкі. Прытым самі вандроўкі, сустрэчы з людзьмі паказаны рэалістычна пераканаўча, таксама, як і ранейшыя ўмовы жыцця хлопчыка.

У паэтычнай гісторыі блуканняў і пакут, трывожных роздумаў і ідэйных пошукаў Сымона праглядваецца яшчэ не меней важная заканамернасць: валодаючы незвычайнай сілай уздзеяння на чалавека, мастацтва заклікана адыгрываць пераўтваральную ролю, яго найвы прызначэнне ў тым, каб змагацца супраць цемр несправядлівасці.




Так, напрыклад, уздзейнічаюць песні чарадзейнага дубка на ўсё жывое:

«І спяваў ён так прыўдала
У той час, як свет сціхаў,
Што аж неба замірала,
І зямля ўся замаўкала,
І дух згоды ахінаў
Тады ўсё яе стварэнне,
Тады ўсё слухала той спеў;
Чэзла зраднае насенне,
І знікалі злосць і гнеў. Ажывала ноч глухая,
Зноў займаўся ясны дзень,
Затраслася сіла злая,
Чуе — кепска: згіне цень…»






У аснову ідэйнага зместу паэмы «Сымон музыка»пакладзена аптымістычная думка аб неўміручасці сапраўднага мастацтва. Але талент можа развівацца, узбагачацца і ў поўную сілу выявіцца толькі тады, калі мастака натхняюць высокія грамадскія ідэалы.





ЗIМА.

Белым снегам замятае
Вецер чорныя палі,
Нібы вопратку ўздзявае
Шыр прасторная зямлі.
Мяккі снег лятае пухам,
І канца яму няма,
І нясе сярдзітым духам,
Дзікім сіверам зіма.
Зачыняйце шчыльна
хату,
Каб не дзьмулі халады,
На акно пляціце мату,
Каб не клаў мароз
сляды.

Даставайце з вышак
сані -
Гайда сцежкі
праціраць
І па белым акіяне
Ўдоўж і ўпоперак
гуляць!
Ды кладзіце рукавіцы
—
Дзе з марозам
жартаваць!
Рады белай мы
зіміцы,
Рады з ёю ваяваць.
Гэй вы, коні, гэй,
малыя!



**ДУБ**.

Сілачом стаіць
Дуб разложысты,
І здалёк відаць
Пышны верх яго.
А ўнізе пад ім
Нёман коціцца,
Срэбрам-стужкаю
Павіваецца.
У нагах трава
Нізка сцелецца,
А вакол ляжыць
Травяністы луг.
Ў глыб зямлі ўвайшлі
Карані яго.
Крэпка дуб стаіць,
Не варушыцца!
Так размашыста
Параскіданы
Ва ўсе стораны
Лапы крэпкія.

Комель — слуп-скала,
Дыша сілаю,
А ўгару зірнеш —
Шапка валіцца.
Дуж ты, дуб стары,
Сын вякоў сівых!
Многа бур ты знёс
На вяку сваім!
Налятаў віхор
З навальніцаю,
Ды не гнуўся ты
Перад бураю!..
Гэй ты, дуб стары,
Вартаўнік лугоў!
Аддае твой шум
Спевам-музыкай.

А пра што шуміш
І аб чым пяеш,
Пра то ведаюць
Ветры вольныя,
Што з табой вядуць
Мову сталую
Ў летні добры час
Або восенню.
Я падслухаю
Гэты шум лістоў,
А з іх гутаркі
Песня зложыцца.




13




Мая першая кніжка
ЯКУБ КОЛАС
УСХОД СОНЦА


ВЫБРАНЫЯ ТВОРЫ
Тарас Гушча
першыя крокі



Гусі.

Зоры далёкія, зоры бліскучыя
Ціха гараць над зямлёй;
Крыкі знаёмыя, крыкі пявучыя
Льюцца вячэрнай парой.
З поўначы-холада, сівера буйнага
Гусі на поўдзень ляцяць;
З неба сьвятлістага, ад сіняй лазурнага
Чудна праменне крычаць.
Дзікія гусанькі, пташачкі вольныя,
Веснікі скорай зямлі!
Хочацца з вамі мне ў сваю прастору
К сьвету і к сонцу ад ц...



Жыта.

Неспакойна зашумела
Жыта маладое,
Зранку самага трывожна
Шэпча зялёнае
Каласочкі на саломках
Галавой качаюць,
Каплі росы на іх лісточкі
Чыстым срэбрам зьзяюць.

Што шуміш так неспакойна,
Жыцейка, у полі?
Ці не чуеш, што пад градам
Загінеш ў родным долу?
Ды і сонца ў цёмных хмарах
Твар свой закрывае.
Ой, відаць — на навальніцу
Зранку прыпякае!
„Што то будзе! што то будзе!"
У мяне шэпча жыта.
Даль наўкола туманамі
Смугою закрыта.
Ох, нехай лепей хмара з градам
Зьнікне ў чыстым полі,
Нехай жыта, нашу ўцеху,
Не кране ніколі.

Не шумі ж ты гэтак сумна,
Маладзенькі колас,
Бо нам у сэрцы смутак родзіць
Шуму твойго голас.

Якуб Колас

У полі.

...ж узгоркаў і курганоў
...лоска вузкая мільгаць
...ь нехай з-за туманоў
...одзінага глядзіць.
Лес акраўся лёгкай тканню,
Дымкай сіняй ўецца гай;
За крывой, далёкай гранню
У блеску ~~тоне~~ віне яго край.



Толькі ж падрэзаны крылья свабодныя;
Крэпка пільнуюць мяне
Дзверы акутыя, сцены халодныя,
Граты жалеза ў вакне.

Мужык.

Гомон № 35. 1917.

Я мужык, бедак пахілы.
Усе абдзіраюць мужыка,
Цягнуць кроў з яго з жылы,
Надрываюць яго сілы,
У мазалёх яго рука.
Я — мужык, я сам пакутны;
На мякіне вырас я.
Гачанамі пуза ўздута,
Ногі ў лапцікі абуты,
Бедна вопратка мая.
Я — мужык, я сам беднота,
Не даем і на дастатак,
Гнуся цэлым днём работы,
Дзень працую за два злоты,
Здзекі ўсякія цярплю.
Я — мужык, не чую двору;
Толькі ёсць мяне чарвяк:
Ці не хлусяць пра свабоду,
Што цару бог даў карону?
Можа што-небудзь да не так.
Я — мужык, а гонар маю;
Гнусь, ды толькі да пары,
Я маўчу, пакуль трываю,
Але скора загукаю:
„Бомы, хлопчыкі, бяры!"

*) Хлусяць, ілгаць.

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна
091
42



Самыя раннія вершы, напісаныя на рускай мове, пазначаны 1898 г. Першым апублікаваным вершам з'яўляецца "Наш родны край" (1906 г., газета "Наша доля").

У 1910 г. у Вільні выйшаў першы зборнік вершаў «Песні-жальбы» (факсімільнае выданне ў 1982), затым - кнігі прозы «Апавяданні» (1912), «Родныя з'явы» (1914). У Пецярбургу ў 1913 г. асобнымі выданнямі выйшлі апавяданні «Тоўстае палена» і «Нёманаў дар», апавяданні вершам «Прапаў чалавек. Паслушная жонка. Грушы сапяжанкі» і «Батрак. Як Юрка збагацеў». У савецкі час выдадзены кніга апавяданняў «Казкі жыцця» (1926, 1-е выданне - Коўна, 1921), зборнік вершаў «Водгулле» (1922), паэма «Новая зямля» (1923), аповесць «У палескай глушы» (1923), зборнікі апавяданняў «Крок за крокам», «На рубяжы», «Першыя крокі», «У ціхай вадзе», паэма «Сымон-музыка» (усе ў 1925), аповесць «На прасторах жыцця» і шмат шмат іншых.

- Аўтар п’ес «Антось Лата» *(1917,* пастаўлена ў *20-*я гады*),* «Забастоўшчыкі» *(1925),* «Вайна вайне» *(1927,* канчатковая рэдакцыя ў *1938,* пастаўлена ў *1937),* «У пушчах Палесся» *(1938,* пастаўлены ў *1937),* аднаактоўкі «На дарозе жыцця» *(1917).* У *1957* г. выйшаў зборнік «Публіцыстычныя і крытычныя артыкулы». Выдаў падручнікі «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» (Пецярбург, *1909)* і «Методыка роднае мовы» *(1926).* Выйшлі Зборы твораў у *7*-мі *(1952), 12*-ці *(1961-1964), 14*-ці *(1972-1978)* тамах.



